# Сёння — дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь. Са святам вас, шаноўныя!

Газета для вас

23 лютага — 1 сакавіка 2001 г.

№ 8 (271)

Грамадска-палітычны штотыднёвік, выдаецца са студзеня 1997 года

Падпісныя індэксы: 63834 (індывідуальная) 64145 (ведамасная)

ІВАЦЭВІЧЫ-БАРАНАВІЧЫ-БЯРОЗА-ПРУЖАНЫ-ДРАГІЧЫН



# IX ЛЁС — САМАЛЁТЫ



Сярод тых, каму наканавана лёсам абараняць Айчыну, нас з вамі, найбольшым аўтарытэтам карыстаюцца лётчыкі. Ім даводзіцца мець справу з крылатымі машынамі — самай сучаснай паветранай тэхнікай. Сярод ваеннаслужачых в/ч 55782, што размешчана каля горада Бяроза, павагай карыстаюцца і тыя, хто рыхтуе самалёты да палёту, і тыя, хто імі кіруе.

**На здымку (злева направа): старшы авіяцыйны тэхнік старшы лейтэнант Аляксандр Чарнышоў, камандзір авіяцыйнай эскадрыллі ваенны лётчык 1-га класа падпалкоўнік Васіль Лісічонак, інжынер эскадрыллі капітан Аляксандр Агееў.**

Фота А. Горбача.

## Поспехі мастака

**БАРАНАВІЧЫ.** Персанальная выстава карцін мясцовага мастака Вячаслава Рыбакова адкрылася ў цэнтральнай выставачнай зале горада. У экспазіцыі 43 творы жывапісу. Тэматыка іх вельмі шырокая.

Дарэчы, у горадзе налічваецца 11 членаў Саюза мастакоў рэспублікі. Вячаслаў Рыбакоў — самы малады, яму 35 гадоў. Праце выкладчыкам выяўленчага мастацтва ў гарадскім цэнтры дзіцячай творчасці. Нягледзячы на сваю маладосць, Вячаслаў Рыбакоў ужо прызнаны мастак. Летась, напрыклад, ён быў удзельнікам міжнароднай галерэі ў Мінску. У ліку 12 лепшых карцін аказалася работа баранавіцкага мастака пад назвай "Пяшчотнасць". Дарэчы, рэпрадукцыя гэтай карціны змешчана ў календары бягучага года, выпушчаным ААН, занесена таксама ў каталог шэдэўраў "Інтэрнета".

**Алесь СЯЛЮК.**

## Эканамічны тупік?

**ІВАЦЭВІЧЫ.** Апошняе пасяджэнне райвыканкама яшчэ раз пацвердзіла, што грошай у дзяржавы нават на выдачу крэдыту для падтрымкі сельскай гаспадаркі напярэдадні веснавых работ пакуль што няма. Так, на рамонт тэхнікі тэрмінова патрэбна 128 мільёнаў рублёў. Івацэвіцкае аддзяленне "Белаграпрамбанка" не ў стане выдаць такі крэдыт. Да таго ж грошы неабходны яшчэ на набыццё гаруча-змазачных матэрыялаў (толькі для пасяўной трэба мець 1800 тон дызпаліва, 630 тон бензіну, 140 тон змазачных матэрыялаў), на набыццё ядахімікатаў, мінеральных угнаенняў, насення, якога не хапае.

Зноў, як і ў мінулыя гады, мясцовая вертыкаль звяртаецца за дапамогай да дзяржаўных рабочых і служачых. Кожнаму працуючаму трэба нарыхтаваць на несельскагаспадарчых угоддзях для калгасна́й жывёлы 400 кілаграмаў сена. У сувязі з тым, што эканамічнае становішча нашых калгасаў значна пагоршылася, ставіцца задача да 1 чэрвеня 70 працэнтаў даведзенага задання выканаць пастаўкай гаруча-змазачных матэрыялаў з розніцу, што тона сена будзе каштаваць 30 тысяч рублёў. Што ж, да касьбы яшчэ далёка, а грошы рабочым і служачым трэба плаціць ужо зараз. З уласнай кішэні і з мізэрных заробкаў. А 70 працэнтаў — гэта нямала — 8400 рублёў. Няўжо гэта выхад з эканамічнага тупіка?

**Алесь СЯЛЮК.**

## Усе даведкі платныя

**ДРАГІЧЫН.** Маецца на ўвазе даведкі, якія дае даведачна-інфармацыйная служба "09". З 1 лютага ў Драгічыне і раёне ў дзённы час (з 8 гадзін раніцы да 10 гадзін вечара) па званку з кватэрнага тэлефона поўная інфармацыя (назва вуліцы, нумар дома, прозвішча) каштуе 19 рублёў, няпоўная (нумар дома або толькі прозвішча ці назва вуліцы) — 39 рублёў.

Арганізацыям даведка аб кватэрным нумары тэлефона па няпоўных дадзеных будзе каштаваць 82 рублі, па поўных — 40 рублёў.

У начны час (з 10 гадзін вечара да 8 гадзін раніцы) з кватэрных тэлефонаў даведка аб нумары іншага гараджаніна ці вяскоўца будзе каштаваць 38 рублёў; аб тэлефонных нумарах арганізацый — 57 рублёў; з тэлефонаў арганізацый аб нумарах тэлефонаў іншых арганізацый — 119 рублёў; званок з арганізацый аб нумары тэлефона кватэры — 79 рублёў.

**Кастусь ДЗЯМЧУК.**

ЧАС РЭСПУБЛІКІ

## Группа ОБСЕ в Минске

Беседой с представителями белорусских профсоюзов начался 19 февраля визит в Минск Урбана Алина (Швеция) и Герта Вайскирхена (Германия) - членов специальной рабочей группы по Беларуси, которую возглавляет Председатель Парламентской ассамблеи (ПА) ОБСЕ Адриан Северин (Румыния).

20 февраля Урбан Алин и Герт Вайскирхен встречался с членами Президиума Верховного Совета Беларуси 13-го созыва, главой Центризбиркома Лидией Ермошиной, министром иностранных дел Михаилом Хвостовым и главой президентской Администрации Михаилом Мясниковичем.

Члены специальной рабочей группы по Беларуси находятся в Минске по поручению мандатной комиссии ПА ОБСЕ. На заседание этой комиссии, которое пройдет 22 февраля в Вене, они предоставили свой доклад о политической ситуации в Беларуси.

## Обвинение предъявлено

19 февраля предъявлено обвинение находящемуся в следственном изоляторе ГУВД Мингорисполкома Александру Чигирю - сыну экс-премьера Беларуси Михаила Чигиря.

Как сообщили БелаПАН в пресс-центре МВД, следователем управления Следственного комитета при МВД Беларуси Александру Чигирю предъявлено обвинение по статье 205, часть 4 Уголовного кодекса Республики Беларусь - тайное хищение имущества, совершенное повторно группой лиц в особо крупных размерах.

Напомним, что Александр Чигирь, Сергей Коляда и Василий Быков были задержаны 10 февраля на одном из авторынков столицы. Следствие утверждает, что некоторые из деталей, которыми торговали эти молодые люди, сняты с украденных автомобилей, обвиняя в причастности к этим кражам Александра Чигиря.

Мать Александра Чигиря Юлия Чигирь узнала от корреспондента БелаПАН о том, что ее сыну предъявлено обвинение. "Я думаю, что наш сын не избалован и пройдет, как и его отец, все испытания с достоинством", - сказала Юлия Чигирь.

## Участились кражи имущества

По данным правоохранительных органов Брестской области, в феврале участились кражи имущества, принадлежащего индивидуальным предпринимателям.

Так, в ночь на 8 февраля неизвестными был вскрыт гараж, принадлежащий жителю Белоозерска (Березовский район), откуда похищено товаров на 1.100 американских долларов. В ночь на 10 февраля грабители вскрыли гараж жителя Пинска: из стоявшего там автомобиля "Фольксваген-Пассат" похищено трикотажных изделий на 800 тысяч рублей. В эту же ночь был ограблен микроавтобус, принадлежавший брестчанину, - неизвестные унесли 150 килограммов яблок, весы и калькулятор.

Комментируя эти факты, руководитель пресс-службы УВД Брестского облисполкома Виктор Василевский обратил внимание на то, что имущество индивидуальных предпринимателей практически не охраняется: автомобили и гаражи не оборудованы охранной сигнализацией.

## Кредитов не будет

В нынешнем году эмиссионные кредиты на посевную кампанию выделяться не будут.

Об этом заявил министр экономики Беларуси Владимир Шимов на пресс-конференции 19 февраля.

По его словам, главным источником финансирования АПК будет "возврат кредитов, которые были выданы в прошлом году". "Специальная комиссия занимается анализом хозяйств, которые брали кредиты, и до сих пор не вернули", - сказал Шимов.

По словам Шимова, сегодня правительство "очень жестко" подходит к возврату кредитов предприятиями АПК.

## Рост цен — 2 процента

По данным Министерства статистики и анализа Беларуси, за первые две недели февраля рост потребительских цен в стране составил 2 процента (за первую неделю - 0,9, за вторую - 1,1).

Для сравнения: за первые две недели января цены выросли на 2,3 процента. С начала года потребительские цены в Беларуси увеличились на 6,9 процента (за этот же период 2000 года - на 20,7 процента, в т.ч. за первые две недели февраля - на 5,8 процента).

(БелаПАН).

# "ПАМЯЦЬ" ПАТРЭБНА ГРАМАДСТВУ,
## але патрабуе дапрацоўкі

**На прэзентацыі гісторыка-дакументальнай хронікі "Памяць. Баранавічы. Баранавіцкі раён", якая адбылася нядаўна, шмат было выказана пафасных слоў.**

Старшыня гарвыканкама В. Дзічкоўскі адзначыў, што гэтая кніжка па свайму зместу бясцэнная. І хоць умовы стварэння хронікі былі не заўсёды спрыяльнымі па фінансавых прычынах, але ж кніжка пасля амаль дзесяцігадовай працы ўбачыла свет.

Не думаю, што мэр, назваўшы кніжку "бясцэннай", меў рацыю. Мала хто з гараджан захоча мець на сваіх паліцах гэтае выданне. Прычына — не дарагавізна. Першыя водгукі чытачоў на гэтую працу гавораць аб расчараванні, якое адрасуецца як стваральнікам хронікі, так і мясцовай уладзе. Менавіта таму гэтую кнігу раздаюць на прадпрыемствах, ва ўстановах, а ў кнігарнях яе няма.

Па-першае, "Памяць" адлюстравала гістарычныя падзеі з погляду яе стваральніка Міхася Берната. А па-другое, многія знакамітыя асобы нашага горада чамусьці адсутнічаюць на старонках выдання. Напрыклад, Ганаровыя грамадзяне Баранавіч У. Царук, У. Заламай і Г. Цапаеў. Няма нарысаў пра ганаровых чыгуначнікаў, будаўнікоў, выкладчыкаў, медыцынскіх работнікаў і другіх. Ёсць і іншыя прабелы ў адлюстраванні гісторыі горада і яго людзей, што абуджае крыўду і абурэнне.

Пазнаёміўшыся з гэтым даўно чакаемым творам, прыходзіш да думкі — навошта было траціць вялікія народныя грошы на стварэнне такога "сырога" выдання, якое, бясспрэчна, вельмі патрэбна грамадству, але патрабуе пэўнай дапрацоўкі.

Рыгор ДРУЖЫНІН.
г. Баранавічы.

## Ці будуць прадаваць насенную бульбу?

**Хутка вясна, і, вядома, пачнецца пасадка бульбы. Для гэтага патрэбна якаснае гатунковае насенне. Летась восенню эксперыментальная база "Майск" прадавала насенныя клубні, праўда, не вельмі якасныя, з паршай. Ці будуць гэтай вясной ладзіць продаж насеннай бульбы?**

**Віктар МОЛАШ, жыхар г. Івацэвічы.**

Як сказаў нашаму карэспандэнту дырэктар эксперыментальнай базы "Майск" В. Р. Асіпік, гатунковую насенную бульбу будуць прадаваць насельніцтву вясной, але ў невялікай колькасці. Гэта звязана з тым, што летась пасевы бульбы падмерзлі і недаатрымана значная частка клубняў.

## Расце і маладзее

ДРАГІЧЫН. Сумна прызнавацца, што злачыннасць "маладзее" і расце. Калі ў раёне ў 1999 годзе было ўчынена 10 злачынстваў непаўналетнімі, то летась іх ужо стала 26. Два падлеткі асуджаны да пазбаўлення волі.

З 109 матэрыялаў, якія былі разгледжаны раённай камісіяй па справах непаўналетніх, 69 былі складзены за розныя правапарушэнні, 38 з іх — па фактах ужывання спіртных напояў. Да таго ж на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх райаддзела міліцыі знаходзяцца яшчэ 30 хлопцаў і дзяўчат. 14 маюць адтэрміноўкі выканання прыгавораў суда або асуджаны ўмоўна.

Выяўлены ў раёне і наркаманы. Афіцыйна іх зарэгістравана сем чалавек. Гэта маладыя людзі. Ёсць у ліку іх і жанчына.

Не выключана, што сярод наркаманаў ёсць і падлеткі, асабліва ў асяроддзі райцэнтраўскіх школьнікаў, якія, па сведчаннях бацькоў, цікавяцца наркатычным зеллем.

Антон ХВЕДАРЧУК.

## Зладзеі пад "напружаннем"

Што ні кажы, а красці ў нас умеюць. Цягнулі ўсё, што пападзе пад рукі. А апошнім часам пачалі "абслугоўваць" электраліні. Калі сказаць прасцей, здымаць электраправады са слупоў нават пад напружаннем. Каму невядома, што гэта вельмі небяспечна? На жаль, усё роўна лезуць на слупы. І дарослыя, і дзеці.

Напрыклад, летась вучань 8 класа Пяркоўскай санаторна-лясной школы Драгічынскага раёна В. Стральчэня ўзламаў замок размеркавальнага ўстройства на трансфарматарнай падстанцыі з мэтай зняць медзь з абсталявання, наблізіўся на недапушчальную адлегласць да токавядучых частак і быў паражоны токам.

У студзені гэтага года жыхар г. Баранавічы А. Чмыр, прабраўшыся на тэрыторыю падстанцыі ў начны час, падняўся па лесвіцы на працуючы трансфарматар, папаў пад напружанне і ўпаў з вышыні 4,5 метра. У цяжкім стане яго даставілі ў бальніцу.

У Івацэвіцкім раёне падобных выпадкаў у апошні час не здаралася. Але частка электраправадоў з дзеючых ліній у вёсках Аляксейкі, Боркі, Плехава, Чамялы і іншых была ўкрадзена. Узбуджана крымінальная справа, ідзе следства, і двое жыхароў раёна па гэтай справе чакаюць суда.

Кастусь ДЗЯМЧУК.

## Самое время бросить

### Выбирай: жизнь или сигареты

18 февраля, во второй половине дня, в доме жителя д. Чемелы Ивана Ермачка вспыхнул пожар. Хозяин, 33-летний инвалид II группы, к тому моменту, пока подоспели соседи, уже был мертв. Причина — курение в постели.

Напомним, что в минувшем году 13 пожаров произошло по этой же причине. Для жителя д. Доманово такое курение закончилось трагически. Неужто есть еще люди, которые не понимают, что ложиться в постель, держа в руках сигарету, крайне опасно. Не слишком ли большая плата за проявленную неосторожность — человеческая жизнь? Самое время бросить эту привычку.

Валерий МОЛОШ.
г. Ивацевичи.

# РЫНКАВАЯ ПЛОШЧА

**Цэны на рынках нашага рэгіёну па стану на 21.02.2001 г. (у руб. за адзін кілаграм):**

| | Івацэвічы | Баранавічы | Бяроза | Пружаны | Драгічын |
|---|---|---|---|---|---|
| Свініна | 2500 | 2500—4000 | 2500—3600 | 2500—3300 | 2500—2800 |
| Сала салёнае | 1900—2500 | 1800—2800 | 2500 | 2600 | 2500—3000 |
| Алей (1 л) | 750—1000 | 700—1100 | 750—950 | 800—1100 | 800—1200 |
| Яйкі | 900—1000 | 800—1000 | 1000 | 1000 | 900—1100 |
| Малако (3 л) | 600 | 600 | 600 | 600 | 600—670 |
| Шпроты | 450 | 400—420 | 450 | 400—450 | 470—500 |
| Масла сметанк. | 1900 | 2000 | 2000 | 2000 | 2000 |
| Бульба | 80—100 | 100—120 | 100 | 100—120 | 100 |
| Цыбуля | 250 | 220 | 250 | 200 | 200—210 |
| Морква | 200 | 150—180 | 180 | 180 | 170—190 |
| Капуста | 100 | 150—180 | 80—200 | 100—120 | 90—100 |
| Грушы | — | 600—1000 | — | — | — |
| Буракі | 60—80 | 100 | 60—80 | 80 | 75—80 |
| Мандарыны | 1800—2000 | 1500—1800 | 1800 | 1800—2100 | 1700 |
| Грэцкія арэхі | 1800 | 1300 | 1500 | 1300 | 1300—1500 |
| Яблыкі | 500—650 | 300—800 | 300—500 | 420—500 | 300—450 |
| Маянэз | 250—450 | 240—420 | 240—420 | 240—450 | 320—500 |
| Вінаград | 4000—5000 | 3500—5000 | 4000 | — | — |
| Хурма | 2500 | 2000—2300 | — | — | 2100—2300 |
| Часнок | 800—1600 | 1800 | 1000 | 800 | 600 |
| Лімоны | 1400—1500 | 1300—1500 | 1500 | 1450 | 1100—1250 |
| Апельсіны | 1200 | 1300 | 1200 | 1400 | 900—1000 |
| Бананы | 1100—1200 | 950—1200 | 1100—1200 | 1450 | 1100—1200 |
| Гранаты | 1900 | 1900 | 1800 | 1600—1800 | 1800 |
| Грэчка | 550—660 | 650 | 550—600 | 700 | 550—600 |
| Макар. вырабы | 520—560 | 500—560 | 600 | 500—600 | 500—630 |
| Рыс | 480—540 | 500—520 | 550 | 550 | 530—550 |
| Манныя крупы | 500 | 460 | 500 | 500 | 500—520 |
| Проса | 320—350 | 330 | 360 | 400 | 350—360 |
| Цукар | 560 | 560 | 550 | 560 | 580 |
| Мёд | 4.000 | 4.000 | 3.600 | 4.000 | 4.000 |

**ВАЛЮТА НА "ЧОРНЫМ" РЫНКУ (руб.)**

| | Івацэвічы | | Баранавічы | | Бяроза | | Пружаны | | Драгічын | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | купля | продаж | купля | продаж | купля | продаж | купля | продаж | купля | продаж |
| 1 долар ЗША | 1215 | 1250 | 1210 | 1240 | 1210 | 1260 | 1200 | 1250 | 1235 | 1285 |
| 1 дойчмарка | 550 | 560 | 560 | 580 | 560 | 590 | 530 | — | 550 | 580 |
| 1 рубель Расіі | 41 | 43 | 42 | 44 | 40 | 44 | 40 | 45 | 42 | 45 |

# О ДОВЫБОРАХ В БЕЛОРУССКИЙ "БЕЗЗУБЫЙ" ПАРЛАМЕНТ

Парламентские выборы не пользуются большой популярностью в Беларуси. Есть много причин, которые могут объяснить широко распространенную среди населения апатию. Во-первых, в стране не проводятся активные избирательные кампании: в связи с введенными властями ограничениями, они рассматриваются зарубежными наблюдателями как скучная административная рутина, направленная на достижение какой-то неопределенной и едва понятной цели. В некоторых случаях кампании оживляются за счет выставления киосков, которые предлагают продукты по сниженным ценам или дефицитные товары. Многие независимые кандидаты хотели бы принимать участие в реальной борьбе, но существующие рамки этого не позволяют. В то же время, есть еще и другие основания для господствующей в стране апатии.


Руководитель Консультативно-наблюдательной группы (КНГ) ОБСЕ в Беларуси Ханс-Георг Вик.
Фото IREX/ProMedia.

### Выборы в "беззубый" парламент.

Обладает ли новый парламент эффективным контролем над исполнительной ветвью властью? На данной стадии конституционного развития, конечно же, нет. Усиление полномочий действующего парламента стало требованием, которое было выдвинуто на национальном и международном уровнях. Президент объявил о планах подобных изменений после президентских выборов. Пока это всего лишь обещания.

### Нерегистрация кандидатов реформистов.

Есть ли у избирателя возможность выбирать между кандидатами противоположной ориентации: теми, кто поддерживает сегодняшнюю политическую ориентацию, и теми, кто выступает за ее "изменение"? В свете приобретенного в ходе прошлогодних парламентских выборов опыта как наблюдатели, так и аналитики, должны принимать во внимание тот факт, что многие кандидаты-реформисты выбыли на этапе регистрации. Поводы для их устранения были неубедительны, что стало очевидным в ходе открытых заседаний Центральной комиссии Республики Беларусь по выборам и проведению республиканских референдумов и Верховного Суда, рассматривавших жалобы и апелляции. Многие потенциальные избиратели полагали, что они были лишены возможности выбора. А следовательно, зачем идти на выборы.

### Нарушения и манипуляции в ходе избирательного процесса.

Из-за доминирующего влияния государственных органов на формирование, заседания и решения избирательных комиссий существуют широко распространенные подозрения о том, что результаты выборов будут в любом случае сфальсифицированы. На протяжении десятилетий выборы в Советском Союзе представляли собой демонстрацию общественностью общей поддержки и квазилегитимизацию коммунистического правления страной. Понятие выбора в пользу подлинных изменений не являлось частью общего понимания того, что такое выборы. Такая ситуация все еще широко распространена и находит отражение в государственном контролировании электронных средств массовой информации. В ряде случаев представители государственных органов отговаривали граждан, работающих в государственных или общественных структурах, от участия в кампании в качестве кандидата, выступающего с критикой правительства. Еще раз необходимо отметить, что подобные ситуации не побуждают людей прийти на избирательные участки, т.к. очевидно, что исход выборов уже предопределен. Миссия по технической оценке БДИПЧ ОБСЕ и члены парламентской "тройки" (Европейский Парламент, Парламентские Ассамблеи ОБСЕ и Совета Европы) заявили о том, что рамочные условия проведения выборов не соответствуют обязательствам Беларуси перед ОБСЕ. В то же время, ряд отдельных парламентариев из стран СНГ и из некоторых парламентов Запада выразили свое удовлетворение относительно демократических и справедливых условий проведения выборов. Можно предположить, что информированный гражданин может отделить подлинную правду от подделки. Институт общественного наблюдателя узаконен в Избирательном кодексе. Кандидаты привлекают наблюдателей для наблюдения за происходящим на избирательном участке в день выборов и, если возможно, за досрочным голосованием, и за голосованием по месту нахождения избирателя. Результатом подобного наблюдения не является систематическое "избирательное дежурство" с последующим анализом данных, полученных с избирательных участков, а также решений участковых и окружных избирательных комиссий, не говоря уже о Центризбиркоме. Вместе с тем, такая интегрированная система была сформирована накануне парламентских выборов. Имеющиеся письменные документы подтверждают значительное число нарушений, таких как вмешательство структур государственной "вертикали" в рассмотрение и принятие решений избирательными комиссиями, независимость которых зафиксирована законодательством. Кроме того, процесс регистрации кандидатов и попытки препятствовать участию независимых членов избирательных комиссий в деятельности и заседаниях комиссий привели к появлению ряда жалоб. В отношении дня выборов было отмечено использование традиционного набора средств фальсификации: корректировка числа зарегистрированных избирателей для достижения требуемой 50-ти процентной явки или наоборот в тех случаях, где оппозиционный кандидат лидировал. Согласно результатам, полученным сетью общественных наблюдателей, явка избирателей была ниже 50% в 34 округах, а не только в 13 официально подтвержденных. Последнее не удивительно для ситуации, которая господствует в Беларуси. Избиратели демонстрировали апатию к выборам и в прошлом. В 1995 г. в ходе выборов в Верховный Совет 13-го созыва из 260 мест лишь 120 были заполнены в ходе выборов в мае, а еще 70 - в ходе довыборов осенью 1995 г. Только после этого парламент достиг требуемого кворума и смог приступить к работе. Процесс демократизации подразумевает не только формирование демократических институтов, но и, прежде всего, существование достаточного уровня понимания демократических ценностей различными слоями гражданского общества. Выборы могут содействовать этим процессам и предлагать гражданам страны альтернативные точки зрения и политические линии.

### Вопреки всему ветер перемен набирает силу.

Есть много причин, почему не следует идти на выборы. Одновременно, существует и другой подход, предлагающий иные выводы.

Многие граждане склонны выступить в поддержку постепенных перемен. Они хотят нечто большее, чем просто выбор между кандидатами от власти и от оппозиции. В условиях, когда ситуация в стране улучшается лишь поверхностно, ухудшаясь в среднесрочной перспективе, они хотят, чтобы им предложили политику перемен, направленную на достижение иной перспективы. В результате, некоторые демократические партии и группы приняли участие в парламентской избирательной кампании. Их нерегистрация - это всего лишь временная победа партии власти, потому что в большинстве случаев сторонники демократов-реформистов составляют наиболее активный сегмент городской общественности.

Сейчас появилась еще одна возможность усилить действительно малочисленную группу реформистов в парламенте для того, чтобы добиться большего разнообразия состава парламента, даже если значительное расширение полномочий парламента не произойдет. Попытки реформирования должны стать видимой частью общественной жизни в каждой из сфер социального, экономического и политического развития Беларуси.

Довыборы, которые пройдут в нескольких важных округах в Минске, Бресте, Витебске, Барановичах и Борисове, станут еще одним экзаменом для избирательных комиссий: в состоянии ли они организовать прозрачные свободные и демократические выборы? Или вмешательство государственных структур, в очередной раз, станет "нормальным" явлением? Будет ли процесс регистрации справедливым? Одновременно, довыборы послужат и тестом для уже существующей интегрированной сети общественных наблюдателей, так же как и предвестником президентских выборов.

## Звяртайцеся ў "Вясну"

Сябры праваабарончага цэнтра "Вясна" і іншых дэмакратычных грамадскіх аб'яднанняў Бярозаўскага раёна працягваюць бясплатнае распаўсюджванне брашуры "Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека. Дэкларацыя аб праве і абавязку розных асоб, груп і органаў грамадства заахвочваць і абараняць агульнапрызнаныя правы чалавека і асноўныя свабоды". Гэта выданне надрукавана на дзвюх мовах, падрыхтавана Цэнтрам па вывучэнню ААН, выйшла да сусветнага дня правоў чалавека — 10 снежня. Аднак да Бярозы, на жаль, дайшло са значным спазненнем.

Тыя, хто жадаюць атрымаць брашуру, могуць звярнуцца ў грамадскую прыёмную праваабарончага цэнтра "Вясна" **(тэл. 2-53-02).**

**Сяржук РУСЕЦКІ,**
**сябра Берасцейскага абласнога аддзялення ГА ПАЦ "Вясна".**
**г. Бяроза.**

## Узносы застаюцца ў "пярвічках"

**Размеркаванне прафсаюзных узносаў у Беларусі адпавядае прынятым у сусветнай практыцы нормам.**

Як адзначаецца ў спецвыпуску газеты "Рабочая солидарность", "дзяржчыноўнікі розных рангаў спаборнічаюць у прыдумках і спекуляцыях наконт размеркавання прафсаюзных узносаў, не турбуючы сябе тым, каб прывесці хаця б адзін дакладны факт".

У Беларусі, як у большасці краін свету, прафсаюзныя ўзносы ўтрымліваюцца з заработнай платы, дапамогі, стыпендыі і пералічваюцца безнаяўным шляхам на рахункі прафсаюзных органаў, гаворыцца ў паведамленні. Прафсаюзны ўзнос у Беларусі складае 1 працэнт ад зарплаты.

У маштабах ФПБ членскія прафсаюзныя ўзносы размяркоўваюцца: 75 працэнтаў застаецца ў пярвічнай прафарганізацыі; 16,2 — пералічваецца абласным, гарадскім і раённым камітэтам галіновых прафсаюзаў, 1,5 працэнта — саветам абласных аб'яднанняў і 2,3 працэнта — Савету ФПБ. Пры гэтым у кожным галіновым прафсаюзе працэнт пералічэння ўзносаў у вышэйстаячыя органы вагаецца, але ў сярэднім ён складае 25-30 працэнтаў.

Прыведзеныя лічбы сведчаць аб тым, што асноўная частка ўзносаў застаецца ў прафсаюзных "пярвічках", расходуецца па іх рашэннях і на іх патрэбы.

**Наталля КУЛАГІНА.**
**("Народная воля").**




(Працяг. Пачатак у №№ 2, 3, 4, 5, 6, 7).

## V. СЭРЦА БАЛЕЛА АБ РАДЗІМЕ

8.

У красавіку 1817 года Касцюшка падрыхтаваў незвычайны па тым часе дакумент, які тычыўся яго- ных землякоў. Вось ён:

**"Пранікнёны той праўдай, што прыгонная залежнасць пярэчыць самой прыродзе і агульнаму дабру айчыны, застаецца дадзеным афіцыйным актам, што вышэйназванае прыгонніцтва адмяняю цалкам на тэрыторыі маёй вёскі Сяхновічы, якая знаходзіцца ў Брэст-Літоўскім ваяводстве, вызваляю сялян на вечныя часы ад прыгонніцкай залежнасці, выкарыстання іх рабочай сілы і выплаты даніны, чым яны і іх нашчадкі былі абцяжараны. Толькі абавязваю іх, каб яны для дабра свайго краю арганізавалі і ўтрымлівалі школу для мясцовай моладзі".**

Такі апошні зварот Тадэвуша Касцюшкі да сваіх сяхновіцкіх землякоў. Але гэта трэба разумець у шырокім сэнсе гэтага слова. Ён хацеў вызвалення для ўсіх — беларусаў, палякаў і літоўцаў. Вельмі хацеў, і ўсё жыццё змагаўся і марыў пра волю, роўнасць і незалежнасць.

Гэтае завяшчанне Тадэвуша Касцюшкі было неадназначна ўспрынята ў Сяхновічах. Пасля яго- най смерці яно было проста забыта новымі землеўладальнікамі.

У канцы верасня 1817 года Касцюшка захварэў і праз два тыдні, 15 кастрычніка, памёр.

Польская паэтэса Марыя Канапніцка пісала:

**А когда он смерть почуял,**
**Меч взял гордою рукою,**
**Молвил: "Бился за Отчизну,**
**В гроб пусть ляжет он со мною!"**

Пахаванне народнага героя адбылося 19 кастрычніка там жа, у гарадку Салюр. А ў 1818 годзе астанкі Тадэвуша Касцюшкі былі ўрачыста перавезены ў Кракаў і змешчаны ў каралеўскім замку Вавель.

Трэба адзначыць, што смерць Касцюшкі выклікала шырокі водгук у свеце. Эмігранты з былой Рэчы Паспалітай, што жылі ў многіх краінах, ушаноўвалі памяць знакамітага земляка памінальнымі службамі, а таксама на сваіх сходах.

## VI. "НАШ КАСЦЮШКА СЛАЎНЫ БЫЎ..."

Удзельнік паўстання 1794 года, падскарбій Вялікага княства Літоўскага, кампазітар Міхаіл Клеафас Агінскі пісаў:

**"Тадэвуш Касцюшка карыстаўся вялікай павагай усёй Еўропы, быў гразой для ворагаў і бажаством для народа; узвышаны да рангу Начальніка, не ведаў іншага гонару як служыць Айчыне і змагацца за яе, заўсёды сціпла сябе паводзіў.., не насіў ніякіх знакаў вышэйшай улады, хадзіў у сурдуце з дрэннага сукна і сталаваўся так, як звычайны афіцэр".**

Гэтае выказванне Агінскага, які ведаў Касцюшку і сустракаўся з ім, пацвярджае вялікую папулярнасць кіраўніка паўстання ў народзе.

У 1903 годзе ў Кракаве выйшла манаграфія "Люд беларускі на Русі літоўскай". Яе аўтар Міхаіл Федароўскі, вядомы даследчык беларускага фальклору. Ён пісаў пра Касцюшку і паўстанне 1794 года ў беларускім фальклоры. Цікавымі падаюцца ўспаміны двух сялян.

**"Касцюшко заваеваў бы свет цэлы, жэб паны яго слухаць хацелі,** — расказваў Ян Дзежка з вёскі Ходараўка, што каля Сухаволі, — **але паны, як паны: гулялі, банкетавалі, Касцюшкі не слухалі, затым і Польшча прапала. Кажуць, цо ў Касцюшкі то быў такі плашч, цо кулі яго не прабівалі: еднага разу маскалі на яго знянацку напалі, так ён не ўспеў таго плашча злажыць, так яго чыста пасеклі і забралі.**

**Касцюшко быў надта адважны і храбры генерал, мой татко спяваў аб ім песню**

**Наш Касцюшко слаўны быў,**
**Маскалёў добро біў,**
**Як Касцюшку злапалі,**
**Кіям бокі златалі...**
**Але далей не ведаю, забыўся".**




Ноты "Касцюшкаўскага марша II", знойдзеныя даследчыкамі.

2.

Другі селянін Банадык Чабёлка з вёскі Малыя Азяранкі, што ля Шыдловіч, расказаў наступнае: **"Як Касцюшка злавілі, то зараз прывялі, дай сказалі яму, каб ён прысягнуў Расіі, так ён сказаў: "На чыёй зямлі стаю, таму прысягаю і за таго голаў палажу!" А ён уперад набраў зямлі ў чобаты, як з Польшчы выяджаў, і на той зямлі прысягаў: от і таму то ён ні зняверыўся. От калі хітры быў да разумны".**

Падобнае паданне пра Касцюшку было запісана Міхаілам Федароўскім у Пружане ад мясцовага мешчаніна Клеменса Кудаевіча.

У зборніку "Белорусские песни" (1869 г.) змешчаны радкі з песні "Засвісталі палячэнькі...". Гэта песня запісана ў Барысаўскім павеце, радзіме Тэклі з Ратомскіх, маці Тадэвуша Касцюшкі. Вось гэтыя радкі:

Шлі шляхта на тры трахта,
Москаль на чатыре,
Пыталіся дарожечкі
До места Кракова,
А з Кракова да Яркова
Шалёныя мілі,
Ляжаць польскія жаўнеры
По тры, по четыре,
Ляжыць, ляжыць пан Касцюшко
Аж пад белым стогам,
Прїхожала, прїедждла
Жана молодая,
Кітаечку падымала,
Ліцо целовала:
"Устань, устань, пан Касцюшко,
Полно воеваці,
Вялікую сілу маюць
Нам яе не ўзяці..."

Песня гэтая яшчэ вядомая пад назвай "Засвісталі казачэнькі".

3.

У розных кутках Беларусі народ складаў песні пра свайго героя, пра заступніка. Напрыклад, на Лепельшчыне на пачатку 60-х гадоў мінулага стагоддзя была запісана песня пра Касцюшку, які загінуў у барацьбе за шчасце свайго народа:

Вазьмі, маці, пяску жменю,
Пасей на каменю.
Калі той пясок узыдзе,
Касцюшка з вайны прыдзе.
Ляціць воран цераз мора,
А лятучы, крача.
А хто ж майго Касцюшачкі
Магілу аплача?

Дарэчы, у час паўстання на Беларусі ў паўстанскіх атрадах спявалі песню, якая называлася "Песня беларускіх жаўнераў". Яна вялікая, у ёй 60 радкоў. Вось некалькі з іх:

Ну жа, хлопцы, ну жа жыва.
Цяпер маем для нас жніва.
Госпадзь бог нам у помач стаець,
Нашу славу нам вяртаець.
Ну жа, жыва вы, сотнікі,
Вы малайцы-дзесятнікі.
Дамо сабе рукі ўзаем.
Бацькаўшчыну адзыскаем.
Коней нам пазаязджалі,
Што хацелі, то і бралі.
Пойдзем жыва да Касцюшкі,
Рубаць будзем маскалюшкі...
Бывай здарова, Грыпіна,
Параска, мая дзяўчына!
Ад вас цяпер ад'язджаем.
Да Касцюшкі ўсе прыстаем.

Як бачым, у песні выказаны думкі і настроі беларускіх паўстанцаў.

4.

Кампазітар Міхаіл Клеафас Агінскі, удзельнік паўстання, які называў сябе "салдатам рэвалюцыі", пазней пісаў: "Я стварыў марш для майго атрада стралкоў са словамі, напісанымі да гэтай музыкі, і з таго часу гэты марш выконваецца ў многіх палках. Я пісаў таксама ваенныя і патрыятычныя песні, якія карыстаюцца вялікім поспехам, паколькі ўзбуджалі храбрасць, энергію і энтузіязм маіх таварышаў па зброі".

Памяць пра паўстанне і Касцюшку назаўсёды захавалася ў сэрцы Агінскага. У ягоным маёнтку Залессе, што на Ашмяншчыне, ім жа ўстаноўлены памятны камень у гонар Тадэвуша Касцюшкі. І яшчэ. Славуты паланез Агінскага "Развітанне з радзімай", напісаны пад уражаннем знаходжання за межамі сваёй краіны, таксама своеасаблівы помнік, але ўжо музычны, тым падзеям, што адбываліся напрыканцы 18 стагоддзя на беларуска-польска-літоўскай зямлі.

Музыказнаўца Вольга Дадзіёмава ў час збору матэрыялаў па гісторыі музычнай культуры гарадоў Беларусі 18 стагоддзя не раз сутыкалася са звесткамі пра легендарнага паўстанца Тадэвуша Касцюшку. Але на гэты раз адкрыўся зусім нечаканы бок захапленняў Тадэвуша Касцюшкі. Выявілася, што ён быў здольны музыкант-аматар. Як сведчаць гістарычныя крыніцы, Касцюшка добра граў на клавікордзе і фартэпіяна, нават спрабаваў складаць музыку для гэтых інструментаў.

5.

Устаноўлена, што ў канцы 18 стагоддзя (праўда, дакладная дата невядомая, але гэта было пасля вызвалення з турмы) Тадэвуш Касцюшка напісаў Паланез для голасу і фартэпіяна. Там былі такія радкі: "Падарожжа нам тваё не міла, ці не лепей у дому была...", якія, па ўсім відаць, сведчылі аб развітанні з родным домам, са сваёй радзімай. З аднаго боку, гэта сум і туга аб пакінутым краі, аб расстанні з землякамі і сябрамі; а, з другога боку, гэта надзея на лепшую будучыню, на вызваленне сваёй краіны ад розных акупантаў — маскалёў, прусакоў і аўстрыякаў.


Даследчыкі адзначаюць, што Паланез Касцюшкі, як і іншых кампазітараў-аматараў Беларусі (Осіпа Казлоўскага, Мацея Радзівіла, Міхаіла Агінскага), мае не толькі гістарычную каштоўнасць, але і музычную, бо ў той час ішло так званае пераасэнсаванне жанру паланеза як танца і ператварэнне яго ў іншыя класічныя творы.

Што ж тычыцца песень пра Касцюшку і, у прыватнасці, пра тых, што спявалі беларускія жаўнеры, то В. Дадзіёмава, знаёмячыся з "Дзённікам Познаньскім" за 23 сакавіка 1882 года, дзе змешчаны тэксты песень, распаўсюджаных на Беларусі ў канцы 18 і ў 19 стагоддзях, знайшла песні **"Слаўна Вільна, слаўна Гродна"** і **"Наш Касцюшка слаўны быў, маскалёў ён добра біў"**.

Акрамя гэтага, у зборніку маршаў і песень Войска Польскага з канца 18—пачатку 19 стагоддзяў змешчаны **"Касцюшкаўскі марш II"**, Ноты і словы яго сведчаць аб тым, што ён быў вядомы і папулярны ў тыя гады.

Паэтычная і музычная творчасць і самых паўстанцаў, і іх кіраўнікоў — яркае сведчанне таго, што жыве ў народзе памяць і пра паўстанне, і пра народнага правадыра Тадэвуша Касцюшку.

*Святаслаў КАЖАДУБ.*
*Івацэвіцкі раён.*
*(Працяг будзе).*



Каталіцкі касцёл св. Кацярыны ў Пецярбургу. Яго наведаў Касцюшка ў снежні 1796 года.




Саркафаг Тадэвуша Касцюшкі ў Кракаве ў касцёле замка Вавель. Упрыгожаны бюстам Касцюшкі і гербамі Польшчы і Вялікага княства Літоўскага.

# Владимир КУДИНОВ: "Я НЕ ЖАЛЕЮ НИ О ЧЁМ..."

**Его имя известно далеко за пределами Ивацевичского района, а тот размах, с которым он разворачивал свою деятельность, уверен, вызывает уважение даже у тех, у кого его личность вообще никаких положительных эмоций не вызывает.**

**Четыре последние года о нём только говорили. Кудинов был в тюрьме, впрочем, об этом написано и сказано более чем достаточно.**

**Похудевший, поседевший, но с особенным блеском умных глаз, Владимир Алексеевич вскоре после освобождения предстал перед коллективом "Газеты для вас". Напомним читателям, что то издание, которое вы в данную минуту держите в руках, основал когда-то предприниматель Кудинов.**

**— Владимир, на судьбу не жалуетесь? Ведь всё прекрасно начиналось когда-то, а вот закончилось...**

— Я не жалею ни о чём. Думаю, моя жизнь — своеобразный оттиск судьбы, предназначенный для того, чтобы показать и обозначить то время, в котором мы живём с вами...

Всегда считал, что самое главное — остаться человеком, прожить жизнь так, чтобы стыдно не было, прежде всего, перед самим собой, перед семьёй, всеми людьми. У меня с большинством знакомых остались хорошие отношения, я несколько суток на свободе, мне все звонят, ко мне приходят. Я жил по человеческим понятиям, мне ни перед кем не совестно.

**— Канула в лету ТПФ "Ивацевичи"... Вопросов не осталось?**

— Осталось. И более чем достаточно. Разрешению этих вопросов я решил посвятить ближайшее время. Чтобы не утомлять ни вас, ни читателя, обозначу суть вкратце. Мне не совсем понятно то, почему за время, пока я был в местах лишения свободы, конфискованы подсобное хозяйство, офис фирмы. Сумма штрафов составляла 4 миллиарда рублей, подсобное хозяйство оценивалось в 13 миллиардов, продали его за 8 миллиардов. Где остальные 4 миллиарда?

Такая же сомнительная ситуация с конфискацией офиса ТПФ. Поверьте, я не хочу ничьей крови, но хотелось бы знать, какими законами руководствовались те, кто принимал решения, кто должен ответить за то, что подсобное хозяйство сегодня разграблено, разворовано? Кто от этого выиграл?

**— Четыре года за решёткой — срок не малый. Кстати, изменилась ли жизнь, Беларусь за это время?**

— Кроме Минска и Ивацевич, я навестил ещё Брест, Слуцк. Знаете, ничего не изменилось. Я вышел в ту же Беларусь. Все те же измученные, уставшие людские лица, те же хозяйства (колхозы-совхозы), которые едва дышат.

Но люди, мне кажется, стали более открытыми, духовными.

**— Чем планируете заняться в самое ближайшее время?**

— Я заслужил отдых. Но мой отдых — общение с людьми. Все эти дни я только и провожу встречи. Ничто так не успокаивает, не акклиматизирует, как общение с хорошими людьми.

Есть некоторые проблемы со здоровьем, но, вы сами знаете, джентльмен не должен много говорить о своём здоровье.

**— Хозяйственная деятельность или политика — чем займётесь?**

— Я не верю, что сегодня можно стать нормальным хозяйственником или предпринимателем, что власть позволит это сделать. Изменения в нашей жизни должны начаться с изменений во власти. Лично я буду работать в команде одного из кандидатов в президенты.

...Мы всё больше и больше отстаём от уровня жизни наших соседей, достаточно беглого взгляда, чтобы убедиться: в экономике — хаос, бестолковщина, инфляция такая же, как и три, пять, семь лет назад, цены растут. Власть без стыда говорит, что чуть ли не половина всех колхозов — банкроты. Но, извините меня, семь лет назад этого не было. Кто ответит за это падение в бездну?

...Когда хозяйства были крепкими, тогда их и надо было реформировать. А что мы видим сегодня? Что приватизировано, что разворовано, техника добита, молодёжь разбежалась. Кому нужны эти ещё не украденные хомуты? Деревню, думаю, ждут ещё очень тяжёлые времена.

**— Государственные СМИ, тем временем, утверждают, что альтернативы Александру Лукашенко нет, мол-де, он один, труженик и кормчий, денно и нощно радеет о нас, не будь его — как бы не погибнуть вовсе. И рейтинг его, кстати сказать, высок.**

